**Baltarusių kalbos pamokų ciklo 9 klasei pavyzdys**

Parengė: Vilniaus pedagoginio universiteto Slavistikos fakulteto lektore Nina Petkevich ir P. Skorinos vidurinės mokyklos baltarusių kalbos mokytoja metodininkė Diana Stachnovič

**Pamokų ciklo tema:** Mokomės skirti meninio teksto temą, pagrindinę mintį, problemą, vertybės pagal poemą Якуба Коласа "Новая зямля"

Šiam pamokų ciklui skirtos 3 pamokos.

## Ryšys su Bendrosiomis programomis:

| | |
|---|---|
| **1. Klausymas ir kalbėjimas** | 1.3. Kalbėti atsižvelgiant į tikslą, adresatą ir bendravimo situaciją: sąmoningai pasirinkti tinkamą leksiką, įvairias sintaksines konstrukcijas, kalbėti taisyklingai, kontroliuoti kūno kalbą, veido išraišką, laikytis kalbos etiketo.<br>1.4. Dalyvauti pokalbyje, interviu arba diskusijoje: klausytis susitelkus, klausti, pritarti, taktiškai prieštarauti, aiškinti savo požiūrį, argumentuoti savo poziciją, padėkoti už taiklią pastabą ar pastebėtą klaidą, gretinti informaciją, daryti išvadas, plėsti kitų mintis, apibendrinti tai, apie ką buvo kalbama. Taikyti diskusijų ir viešojo pokalbio kultūros taisykles. |
| **2. Skaitymas, literatūros ir kultūros pažinimas** | 2.1.A. Daryti teksto visumą apibendrinančias išvadas: remiantis tiesiogiai pasakytais dalykais, potekste ir kūrinio kontekstu, nurodyti teksto tikslą, temą, problemas, formuluoti pagrindinę mintį, aptarti vertybes.<br>2.1.B. Interpretuoti skaitomus tekstus: paaiškinti netiesiogiai pasakytas mintis, požiūrius, kūrinyje vaizduojamas situacijas remiantis įvairių sričių žiniomis, teksto visuma, teksto istoriniu kultūriniu kontekstu.<br>2.1.C. Analizuoti, kaip tekstuose kuriama prasmė: aptarti pasakojimo ar kalbėjimo situaciją, vaizduojamojo pasaulio elementus grožiniuose kūriniuose. Aptarti, kaip kalbinės raiškos ir komponavimo priemonėmis siekiama įvairių tikslų grožiniuose tekstuose. |
| **3. Rašymas** | 3.1.A. Parašyti samprotaujamojo pobūdžio tekstą.<br>3.1.B. Parašyti trinarės struktūros straipsnį, derinant pasakojimą bei aprašymą su samprotavimo elementais.<br>3.1.F. Siekti vaizdumo, gyvumo, naudojantis leksikos ir sintaksės teikiamomis galimybėmis<br>3.1.I. Taikyti daugumą rašybos, skyrybos, gramatikos taisyklių; siekti mintis formuluoti aiškiai, tiksliai, glaustai (Žr. Turinio apimtis). |

**Santrauka**

Pamokų ciklo metu mokiniai nagrinėja poemą J. Kolaso „Novaja zemlia“. Šiam pamokų ciklui skirtos 3 pamokos. Interpretuojant kūrinį, mokiniai kritiškai vertina tekstą. Jie, tobulina gebėjimą suvokti temą, pagrindinę mintį ir problemos, aptaria vertybes; aiškina teksto istorinių (kultūrinių) kontekstą. Tai pat mokiniai atpažįsta kūrinyje pagrindinės kalbinės raiškos priemonės, paaiškina jų funkciją, aiškina ir apibendrina savo įspūdžius, kuria samprotaujamojo pobūdžio tekstą.

Integrali pamokų dalys – gimtosios kalbos ir istorijos, muzikos, dailės ir kompiuterinių technologijų integracija. Dalis informacijos pateikiama pasitelkiant kompiuterinėmis technologijomis.

Pamokų metu integruojamos visos kalbinės veiklos sritis (klausymas, kalbėjimas, skaitymas, rašymas). Nagrinėdami, interpretuodami, vertindami ir patys kurdami tekstus mokiniai ugdosi kritinio mąstymo gebėjimus. Jie nagrinėja, vertina įvairus požiūrius, mokosi argumentuotai diskutuoti, apginti savo požiūrį.

Mokiniai dirba poromis ir individualiai.

Pamokos pradžioje mokytojas informuoja, kad bus kaupiamuoju balų vertinami trejų pamokų mokinių gebėjimai. Pamokų ciklo metu taikomi įvairūs vertinimo būdai, kurie priklauso nuo konkrečios ciklo pamokos tikslų: vienas kito ir savęs vertinimas, formalusis vertinimas, mokinių refleksija, mokytojo pastabos ir komentarai. Pamokų ciklas pasibaigia testu, už kurį kiekvienas mokinys gauna pažymį.

## Урок 1

### *Вызначэнне праблем у паэме Якуба Коласа “Новая зямля”*

**Віды дзейнасці:** праца з тэкстам, гутарка, дыскусія, творчая праца.

**Абсталяванне**: тэкст твора, запіс музыкі І.Лучанка да ўрыўка “Леснікова пасада” (з паэмы “Новая зямля”), мультымедыйны праектар, камп’ютар.

### Ход урока:

Вучням тлумачацца задачы цыкла ўрокаў, калектыўна абмяркоўваюцца асноўныя віды дзейнасці, крытэрыі ацэнкі гэтай дзейнасці.

Абапіраючыся на раней атрыманыя веды, вучні робяць падрабязны каментарый да слайдаў (**ž. PRIEDĄ**), звязваючы яго (каментарыя) змест са зместам паэмы “Новая зямля”, каб выканаць наступнае заданне: *Дакажыце, карыстаючыся звесткамі з жыцця і творчасці Я. Коласа, што паэма “Новая зямля” – твор аўтабіяграфічны.*

***Тлумачэнне новага матэрыялу***: Слова настаўніка:

*– Паэма «Новая зямля» – твор незвычайны. Кожны радок з замілаваннем і няўлоўным сумам апавядае пра прыгажосць родных мясцін. Напэўна, любоў паэта да сваёй маленькай радзімы натхніла беларускага кампазітара І. Лучанка да стварэння музычнага твора: ён напісаў музыку да ўрыўка з раздзела “Леснікова пасада”, і ў выніку атрымалася песня. Давайце мы з вамі яе паслухаем. Паспрабуйце ўявіць карціны прыроды, створаныя мастаком слова* (на экране – словы песні):

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе ня маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю...

І там душою спачываю...
Вось як цяпер, перада мною
Ўстае куточак той прыгожа,
Крынічкі вузенькае ложа

І елка ў пары з хваіною,
Абняўшысь цесна над вадою,
Як маладыя ў час кахання,
Ў апошні вечар раставання.

Люблю цябе, мой бераг родны,
Дзе льецца Нёман срэбраводны,
Дубы дзе дружнай чарадою
Стаяць, як пешы, над вадою.
Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе ня маю сілы!
Забыць цябе ня маю сілы!

– *Што вы ўявілі? Якія карціны маглі б зараз намаляваць і якія фарбы выкарысталі б для гэтага?*
– *Які колер пераважае ў аўтара? Чаму менавіта гэты?*
– *Якія гукі можна пачуць?*
– *Якаі мастацкія сродкі выкарыстоўвае аўтар, паказваючы прыгажосць роднага краю, "кута"? (Знайдзіце ў тэксце эпітэты, параўнанні, метафары. Растлумачце іх мастацкі сэнс.)*
– *Які настрой пераважае ў гэтай частцы твора? Чаму?*
– *А як бы вы расказалі пра свой родны кут? Напішыце міні-сачыненне на тэму "Мой родны кут".* (Гучыць спакойная, ціхая музыка).

Вучні (па жаданню) зачытваюць свае творчыя працы. Клас ацэньвае іх. Прыклады сачыненняў:

***"Мой родны кут..."***

***Родны кут, Радзіма. Для кожнага чалавека паняцце радзімы вельмі асабістае. Напэўна, адчуванне радзімы прыходзіць да нас яшчэ ў дзяцінстве. Гэта і гурба, у якую ты валішся са смехам, і ручаёк, па якім ты пускаеш папяровыя караблікі, і дрэвы-асілкі ў парку, як з казкі. Гэта і сямейныя святы, і расказы бабулі пра мінулае, гэта і сябры, перапіска, чаканне і настрой. А яшчэ – гэта тое месца, дзе цябе любяць і чакаюць.***

***"Мой родны кут..."***

***Я нарадзілася ў цудоўным горадзе. Гэта шматнацыянальны горад, які на працягу многіх стагоддзяў быў культурным цэнтрам Беларусі.***

***Яшчэ ў 1522 годзе Ф. Скарына выдаў тут на беларускай мове "Малую падарожную кніжыцу", у 1906 г. гэты горад падарыў Беларусі першыя беларускія газеты "Наша Доля" і "Наша ніва". З ім звязаны лёс многіх беларускіх мастакоў і пісьменнікаў, класікаў беларускай літаратуры: Ф. Багушэвіч, Цётка, Якуб Колас, Янка Купала, Максім Танк, Наталля Арсеннева, Зоська Верас, Ядвігін Ш., Максім Гарэцкі – вось далёка няпоўны іх пералік.***

***Пачынаючы з ранняга Сярэднявечча і да апошняй вайны, менавіта мой родны горад быў духоўным домам для беларусаў. Я ганаруся горадам, які з'яўляецца сталіцай Літвы і маёй радзімай.***

Настаўнік: – *У паэме "Новая зямля" аўтар не толькі паказвае прыгажосць родных краявідаў, але і ўздымае пэўныя праблемы. Давайце вызначым праблемы, узнятыя аўтарам, па наступных урыўках.* Урыўкі праецыруюцца на экран. Вучні самастойна (у сшытках) вызначаюць праблемы, пасля аргументавана тлумачаць свой варыянт. Выбіраецца агульны.

Даўно ўжо бацька жыў думою
Разжыцца ўласнаю зямлёю
І не залежаць ні ад кога,
Не знаць начальства ніякога.
Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць...

*Праблема: чалавек і зямля.*

Сямейка, праўда, немалая:
Чатыры хлопцы, тры дзяўчаці
Ды бацька з дзядзькам, трэцця маці...
А за сталом маўчком сядзелі
Там хлопцы чыркацца не смелі,
Бо там парадак вельмі строгі...

*Праблема: чалавек і сям'я.*

Куцця. Марозна. Хмурнавата.
Сняжок падкідвае заўзята;
Снег на куццю — грыбы на лета,
Такая матчына прымета...

*Праблема: чалавек і свет народных звычаяў і свят.*

Мароз — паважны. Як вяльможа,
Знасіць свавольніцтва не можа,
І на той час, як ён пануе,
Па небе хмарка не вандруе...

*Праблема: чалавек і прырода.*

**Абагульненне матэрыялу:** *Класічны твор – той у якім ўздымаюцца праблемы, актуальныя ва ўсе часы. Ці можам мы паэму Я.Коласа “Новая зямля” лічыць класічным творам?*

## Рэфлексія:

– *Што новага вы даведаліся на ўроку?*
– *Выкажыце свае пажаданні па арганізацыі ўрока.*
– *Ацаніце сваю працу на ўроку.*

**Дамашняе заданне:** вучні абменьваюцца сачыненнямі і дома ацэньваюць іх, робячы падрабязны каментарый.

**Ацэньванне:** настаўнік ацэньвае актыўнасць вучняў на ўроку, хваліць іх, робіць заўвагі, выказвае пажаданні.

## У р о к 2

## Вырашэнне праблемы “чалавек і зямля” ў паэме Я. Коласа “Новая зямля”

**Мэты:**

Вучні:

1) Умеюць характарызаваць літаратурнага героя;
2) выкажуць свае меркаванні і аргументавана іх абароняць.

**Віды дзейнасці:** праца з тэкстам, праца ў групах, дыскусія.

**Абсталяванн**е: тэкст твора, ілюстрацыі да паэмы.

***Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,***
***Каб з панскіх выпутацца пут.***
Я. Колас “Новая зямля”

**Ход урока:**

Праверка дамашнягя задання. Выбарачна зачытваюцца сачыненні і іх аргументаваныя ацэнкі.

Настаўнік. – *На мінулым уроку мы высветлілі, што адной з галоўных праблем паэмы з’яўляецца праблема “чалавек і зямля”. Каб зразумець аўтарскае разуменне гэтай праблемы, мы павінны адказаць на пытанні “Чаму Міхал так імкнецца купіць зямлю, вызваліцца ад улады пана? Ці стане ён свабодным, калі купіць зямлю?”. Да адказу на гэтыя пытанні неабходна звярнуцца і да іншых вобразаў паэмы.*

Клас дзеліцца на чатыры групы.

Першая група даследуе вобраз Міхала.

*– Што мы даведваемся пра Міхала з раздзела “На першай гаспадарцы”? Чаму ён вымушаны быў пайсці да пана на службу?*

*–Як выконваў свае абавязкі Міхал? Што за гэта меў ад пана? Як да яго адносіліся сяляне?*

*– Якія рысы характару Міхала падкрэслівае аўтар?*

*– Міхал жыве даволі заможна (пацвердзіце гэту думку тэкстам). Чаму ж ён увесь час думае пра сваю ўласную зямлю? Што не дае спакою галоўнаму герою? Ці на самай справе Міхал стане свабодным, калі зможа купіць надзел зямлі?*

*–Чаму мара Міхала не спраўдзілася?*

Другая група вызначае значэнне вобраза зямлі.

*– У якіх значэннях выкарыстоўваецца слова “зямля” ў творы? Дакажыце радкамі з тэксту. Прадоўжыце рад: зямля – родны кут – …*

*– Чаму твор атрымаў такую назву?*

*– Якая думка з'яўляецца асноўнай у паэме?*

*– Як адносяцца да зямлі галоўныя героі твора? Дакажыце радкамі з тэксту.*

Трэцяя група даследуе вобраз Антося.

*– Як Антось апынуўся ў Міхалавай сям'і? Якія абавязкі меў?*

- *Якія факты даказваюць, што дзядзька Антось быў дбайным гаспадаром?*
- *Ці падзяляе Антось думкі Міхала наконт куплі зямлі?*

- *У чым упэўніўся герой, калі пабываў у Вільні?*
- *Ці ёсць такія гаспадары, як Антось, у наш час? Чаму вы так лічыце?*
- *Якія асаблівасці характару Антося выяўляюцца ў розных умовах жыцця? – У барацьбе з якімі сіламі герой выходзіць пераможцам і перад якімі вымушаны скарыцца?*

Чацвёртая група даследуе вобраз Ганны.

- *Ганна – другарадны ці галоўны герой паэмы? Чаму вы так лічыце?*
- *Што мы даведваемся пра Ганну з паэмы?*
- *Як гэты вобраз звязаны з тэмай зямлі?*

## Прадстаўленні груп і адказы на пытанні:

– Ці можна сказаць, што галоўныя героі паэмы – сапраўдныя гаспадары зямлі (хоць зямля афіцыйна ім не належыць)? Ці ёсць такія гаспадары ў нашым грамадстве?
– Да якой думкі падводзіць нас сваім творам Я. Колас?

**Ацэньванне:** праца кожнай групы ацэньваецца прадстаўнікамі іншых груп і выводзіцца агульная адзнака.

## Рэфлексія:

- *Ці спадабаўся вам урок?*
- *Ці спадабалася праца ў групах? Вашы прапановы па арганізацыі такой працы.*
- *Ці ўдалося вам рэалізаваць свае магчымасці, працуючы ў групах?*
- *Ці ўдалося вам зразумець галоўную праблему, узнятую ў творы Я. Коласам?*

***Дамашняе заданне*** (на выбар):

1. Падрыхтуйце вусны адказ на пытанне "Ці зразумеў Міхал перад смерцю, што яго намаганні і мары былі нязбытныя, нерэальныя?".
2. Напішыце міні-сачыненне на тэму "Каго можна лічыць гаспадаром зямлі?"

# УРОК 3

## Выніковы тэст па цыклу ўрокаў

## Тэст

(ацэньваецца 10 баламі. За кожны правільны адказ 1 бал)

**1. Асноўная тэма паэмы Я. Коласа «Новая зямля»...**

*а) паказ жыцця лесніка;*
*б) замілаванасць прыродай;*
*в) любоў да Радзімы;*
*г) паказ сялянскага жыцця*.*

2. Адзін з раздзелаў паэмы «Новая зямля» называецца-

*а) «Дзядзька-пчаляр»;*
*б) «Дзядзька-кухар»*;*
*в) «Дзядзька-майстар»;*
*г) «Дзядзька-жартаўнік»*

3. Якую праблему не ўзнімае Я. Колас у паэме?

*а) чалавек і зямля;*
*б) чалавек і мастацтва*;*
*в) чалавек і прырода;*
*г) чалавек і сям'я.*

4. Што паслужыла штуршком і зыходным момантам напісання паэмы?

*а) апавяданне пра лёс беззямельнага селяніна;*
*б) назіранні маладога настаўніка за жыццём палешукоў;*
*в) гісторыя жыцця ўласнай сям'і.**

5. У якіх значэннях выкарыстоўваецца слова зямля ў прыведзеным урыўку?

Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,
Зямля дасць волі, дасць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы.
Зямля дзяцей тваіх не кіне
Зямля – аснова ўсёй Айчыне.

*а) тэрыторыя, якая знаходзіцца ў чыім-небудзь уладанні*;*
*б) родны кут, дзе чалавек нарадзіўся і ўзрос*;*
*в) краіна, дзяржава*;*
*г) сродак існавання чалавека*;*
*д) сродак узбагачэння.*

6. Якія рысы характару ўласцівыя дзядзьку Антосю як адмысловаму гаспадару?

*а) здатны майстар на ўсе рукі*;*
*б) старанны працаўнік;**
*в) рызыкоўны, здольны да камерцыі.*

7. Чым прываблівае дзядзька Антось дзяцей?

*а) уключаў разам з сабой у штодзённую працу;*
*б) ствараў ім душэўны камфорт, расказваючы цікавыя байкі і жарты, наладжваючы гульні*;*
*в) прыносіў са сваіх падарожжаў ласункі і прысмакі*;*
*г) зачароўваў адкрытасцю, шчырасцю, таленавітасцю, непасрэднасцю сваёй натуры*.*

8. Чаму Міхал хацеў купіць зямлю?

*а) хацеў змяніць месца жыхарства, бо любіў перамены ў жыцці;*
*б) хацеў разбагацець на ўласнай зямлі;*
*в) імкнуўся атрымаць свабоду, не быць залежным ад паноў;**

9. Якія традыцыйныя святы і звычаі беларусаў апісаны ў паэме?

*а) Купалле;*
*б) Вялікдзень;*
*в) вяселле;*
*г) Каляды;*

10. Якое месца займае вобраз Ганны ў паэме?

*а) вобраз Ганны займае цэнтральнае месца ў паэме ;*
*б) Ганна – другарадны персанаж паэмы;*
*в) Вобраз Ганны займае невялікае, але важнае месца ў паэме.*

Пасля выканання работы на дошцы змяшчаюцца адказы, вучні абменьваюцца сшыткамі і правяраюць правільнасць выканання тэсту. Падводзячы вынікі праведзенай работы, настаўнік называе найбольш тыповыя памылкі і ўсе разам паўтараюць тыя тэмы, якія аказаліся найбольш складанымі.